WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

15 КРАСАВІКА 2010 г. ЧАЦВЕР
№ 72 (26680)

Кошт 650 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

**Прамая лінія**

## ЗНЕШНІ БОК СПРАВЫ

Усё больш людзей купляюцца на рэкламу, чакаюць цудаў ад тых ці іншых касметычных сродкаў. Карэкцыя касметычных заган у выніку дэрматалагічных захворванняў, траўмаў і г.д. акажацца ў цэнтры ўвагі «прамой лініі», якая адбудзецца **СЁННЯ з 14.00 да 15.30 па нумарах 8 (029) 292 38 92 і 292 38 21.** Пра новы падыход у згаданай галіне раскажа **дацэнт кафедры дэрматавенералогіі Беларускай медыцынскай акадэміі паслядыпломнай адукацыі, урач-касметолаг вышэйшай катэгорыі Мікалай Афанасьевіч ПАПІЙ.**

## За І квартал ВУП вырас на 4 працэнты

**Паводле звестак Нацыянальнага статыстычнага камітэта, ВУП у першым квартале склаў у бягучых цэнах 31 трыльён 947,2 мільярда.**

У першым квартале мінулага года ў параўнанні з першым кварталам 2008 года рост ВУП складаў 1,1 працэнта. Сёлета ў студзені—сакавіку аб'ём вытворчасці прамысловай прадукцыі павялічыўся на 5,9 працэнта, аб'ём выпуску спажывецкіх тавараў — на 9,3 працэнта, у тым ліку харчовых — на 11,1, нехарчовых — на 7,7 працэнта, аб'ём сельскагаспадарчай вытворчасці вырас на 5,3 працэнта.

**Ігар ГРЫШЫН.**

Аляксандр ЛУКАШЭНКА:

# «РАСІЯ ПАЧЫНАЕ ЎСВЕДАМЛЯЦЬ ПАМЫЛКОВАСЦЬ СПРОБАЎ НАЦІСКУ НА БЕЛАРУСЬ»

**Аб гэтым заявіў учора Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка, адказваючы на пытанні журналістаў падчас рабочай паездкі па Гомельскай вобласці.**

«Лічу, Расія разумее, што была дапушчана прыкрая памылка — прынятыя спробы націску на Беларусь. Гэта бесперспектыўна, — падкрэсліў беларускі лідар. — І перакананага саміту СНД у Маскве 8 мая, можа, у канцы мая або пачатку чэрвеня, як мы звычайна сустракаліся ў Сочы», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Падчас сустрэчы са сваім расійскім калегам Прэзідэнт Беларусі мае намер абмеркаваць перспектывы ўдзелу расійскага капіталу ў акцыянаванні беларускіх прад-

што блакаванне нашых тавараў на расійскім рынку прывяло да вельмі негатыўных вынікаў для саміх расіян», — заўважыў кіраўнік беларускай дзяржавы.

Ён зноў падкрэсліў, што палітыка блакавання з боку Расіі цалкам бесперспектыўная: Беларусь даказала, што яна можа выходзіць на іншыя, альтэрнатыўныя рынкі, ствараць



Фота БЕЛТА.

ны, Прэзідэнт Расіі сёння гэта вельмі добра пачынае ўсведамляць».

Паводле слоў Аляксандра Лукашэнкі, яго бліжэйшая сустрэча з Дзмітрыем Мядзведзевым, хутчэй за ўсё, адбудзецца на працягу мая. «Мы з Дзмітрыем Анатольевічам нядаўна некалькі разоў размаўлялі па тэлефоне, і ён прама сказаў: пара нам сустрэцца, паразмаўляць, назбіралася шмат пытанняў, часам наносных, якія мы можам вырашыць. Я поўнасцю падтрымаў яго пункт гледжання. І цяпер кіраўнікі прэзідэнцкіх адміністрацый прапрацоўваюць аптымальныя тэрміны сустрэчы. Яна, магчыма, адбудзецца напярэдадні нефармаль-

прыемстваў. Акрамя таго, будуць разглядацца стратэгічныя пытанні развіцця Мытнага саюза Беларусі, Казахстана і Расіі. «Я хачу дакладна разумець, што менавіта Расія і Казахстан хочуць ад МС і што ў такім выпадку будзе ад яго мець наша краіна, — адзначыў беларускі лідар. — Калі гэта будуць адны выключэнні, пошліны па нафце, газу і гэтак далей, то ў Беларусі напалову знізіцца цікавасць да такога саюза».

Акрамя таго, Аляксандр Лукашэнка мае намер абмеркаваць з Дзмітрыем Мядзведзевым пытанні доступу прадукцыі беларускіх прадпрыемстваў на рынак РФ. «У прынцыпе ўжо цалкам зразумела,

айчынную імпартазамяшчальную вытворчасць.

«Нам няма ніякага сэнсу сварыцца з Расіяй. Мы ні з кім не заігрываем. Але калі нас пачынаюць біць і штурхаць у спіну — мы шукаем шчасця ў іншых пунктах планеты», — адзначыў Прэзідэнт. Беларусь можа адысці ад энергетычнай залежнасці ад Расіі па нафце і газу. «Нашы нядаўнія дамоўленасці з Венесуэлай — таму сведчанне», — дадаў Аляксандр Лукашэнка.

«Галоўнае, каб маючая адбыцца сустрэча з Прэзідэнтам Расіі дала канкрэтныя вынікі, — сказаў беларускі лідар.

СТАР. 2

## У СУБОТУ ЎНАЧЫ МОКРЫ СНЕГ І ЗАМАРАЗКІ

**Сёння ўдзень яшчэ захаваецца цёплае надвор'е, будзе 12—18 цяпла, а вось ў пятніцу надвор'е істотна сапсуецца, паведаміла рэдакцыі галоўны сіноптык Рэспубліканскага гідраметцэнтра Вольга ФЯДОТАВА.**

Заўтра — дажджы. Уначы плюс 2—8, удзень — 9—16. Ужо ў суботу пахаладае. Кароткачасовыя дажджы, а ўначы па паўночным захадзе магчымы мокры снег. Уначы ад мінус 1 да плюс 6 градусаў, удзень 5—12. Няўстойлівае надвор'е захаваецца і ў нядзелю, калі ўначы будзе ад 2 марозу да 5 цяпла, удзень — ад 5 цяпла па паўночным захадзе да 16 градусаў на паўднёвым усходзе. Уначы кароткачасовыя дажджы. У пачатку наступнага тыдня — чарговая хваля холаду. Уначы ад мінус 4 да плюс 5, удзень — 4—11. Зноў пацяплее толькі напрыканцы наступнага тыдня.

**Сяргей КУРКАЧ.**




ISSN 1990 - 763X

**Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 15.04.2010 г. (для б/н разлікаў)**

| | |
|---|---|
| ▼1 долар ЗША — 2 960,00 | 1 чэшская крона — 160,95 |
| ▲1 еўра — 4 031,82 | 1 польскі злоты — 1 043,54 |
| 1 латвійскі лат — 5 714,29 | ▲1 расійскі рубель — 101,91 |
| 1 літоўскі літ — 1 168,94 | 1 украінская грыўня — 373,74 |

**Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў Цэнтрабанк РФ**

| | |
|---|---|
| USD | 29,0444 |
| 10 UAH | 36,4742 |
| 1000 BYR | 9,7432 |
| EUR | 39,6253 |

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

## Рэспубліканскі суботнік пройдзе 24 красавіка

**Такое рашэнне прынята пастановай Савета Міністраў Беларусі № 530, паведамілі карэспандэнту БЕЛТА ў Апараце Саўміна.**

Суботнік арганізуецца ў сувязі са святкаваннем 65-годдзя Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне 1941—1945 гадоў, аб'яўленнем 2010 года Годам якасці.

Рэкамендавана правесці рэспубліканскі суботнік на добраахвотнай аснове. Людзі будуць працаваць на рабочых месцах або добраўпарадкоўваць і прыводзіць у належны стан населеныя пункты, мемарыяльныя комплексы, месцы баявой і воінскай славы, пахаванні воінаў і партызан Вялікай Айчыннай вайны...

Грашовыя сродкі, заробленыя на рабочых месцах у дзень суботніка, у аб'ёмах, што вызначаюцца работнікамі, у добраахвотным парадку пералічаюцца праз раённыя і гарадскія выканкамы. Пры ўдзеле ў рэспубліканскім суботніку некамерцыйных арганізацый па рашэнні калектываў работнікаў гэтых арганізацый грашовыя сродкі могуць пералічацца ў памерах, што вызначаюцца добраахвотна самімі калектывамі. Таксама добраахвотна праводзіцца ўтрыманне наймальнікамі грашовых сродкаў з заработнай платы работнікаў, для якіх 24 красавіка 2010 года з'яўляецца рабочым днём. Адказнасць за нямэтавае выкарыстанне грашовых сродкаў ускладаецца на службовых асобаў адпаведных дзяржорганаў.

## КУЗЬМІЦКАЯ РАДАЎНІЦА



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Неўзабаве будзе 20 гадоў, як вёску Кузьмічы закапалі пасля аварыі на Чарнобыльскай атамнай станцыі, а на яе месцы засталіся толькі могілкі. Колішнія вяскоўцы жывуць цяпер у розных куточках Беларусі, але малая неіснуючая радзіма па-ранейшаму кліча і збірае іх да сябе.**

СТАР. 6

## АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА ВЫКАЗАЎ СПАЧУВАННІ Ў СУВЯЗІ З ТРАГІЧНАЙ ГІБЕЛЛЮ ЛЕХА КАЧЫНЬСКАГА І ГРАМАДЗЯН ПОЛЬШЧЫ

**У сувязі з авіякатастрофай у Смаленскай вобласці, у якой загінуў Прэзідэнт Польшчы Лех Качыньскі і грамадзяне Польшчы, ад імя беларускага народа і сябе асабіста Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 10 красавіка выказаў глыбокія спачуванні маршалу Сейма Рэспублікі Польшча Браніславу Камароўскаму, а таксама родным і блізкім загінулых.**

«Вялікае гора здарылася ў блізкай нам дзяржаве, з якой Беларусь звязваюць даўнія гістарычныя і культурныя адносіны. Пачуццё глыбокага жалю па трагічна загінулых у авіякатастрофе Прэзідэнце і грамадзянах Рэспублікі Польшча ахапіла нашы сэрцы, — гаворыцца ў спачуванні. — Кіраўніцтва Рэспублікі Беларусь і ўвесь беларускі народ выказваюць шчырыя спачуванні родным і блізкім загінулых, а таксама польскім уладам. Мы разумеем, якія незаменныя страты для народа Польшчы прынесла гэта трагедыя. У вельмі цяжкі для вашай краіны час прыміце словы нашай падтрымкі і глыбокага спачування».

## ПРЭЗІДЭНТ БЕЛАРУСІ ДАРУЧЫЎ РЭГІЯНАЛЬНЫМ УЛАДАМ АКАЗВАЦЬ МАКСІМАЛЬНАЕ САДЗЕЙНІЧАННЕ ПОЛЬСКАМУ БОКУ

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 10 красавіка даручыў рэгіянальным уладам аказваць максімальнае садзейнічанне польскаму боку ў транзітным перамяшчэнні і іншую дапамогу, якая можа яму спатрэбіцца на тэрыторыі Беларусі.**

Свае спачуванні прэм'ер-міністру Польшчы Дональду Туску накіраваў прэм'ер-міністр Беларусі Сяргей Сідорскі.

Глыбокія спачуванні ў тэлефоннай размове з міністрам замежных спраў Польшчы Радаславам Сікорскім выказаў і міністр замежных спраў Беларусі Сяргей Мартынаў.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

Фота БЕЛТА.



## СЛОВЫ Ў ПАМЯЦЬ...

**Апошнія дні так ярка, па-веснавому свеціць сонейка, так прыгожа за акном, але ціха... Чамусьці нават птушкі не спяваюць... Навокал светла... Але не на сэрцы. Быццам апусцілася заслона і стала страшна... А на душы цяжка: там ляжыць велізарны камень... Камень невыказнага болю і смутку. У галаве сапраўдны вэрхал, думкі хаатычна змяняюць адна адну, не магу разабрацца ў іх, слёзы душаць... Так прайшоў першы дзень трагедыі, польскай і маёй асабіста.**

Пачула пра яе ад свайго сябра і раптам нешта ў грудзях абарвалася: «Можа, што пераблытаў? Штосьці не зразумеў?.. Яны не маглі... Гэта неверагодна!» Уключаю тэлевізар, праглядаю інтэрнэт...

На будынку Пасольства Польшчы ў нашай краіне ў гэтыя дні прыспушчаны сцяг у знак смутку. Сюды падносяць кветкі... Прыгожыя жывыя кветкі ў памяць тых, каго больш няма сярод нас, — загінулай эліты, польскай дэлегацыі, якая накіроўвалася на мерапрыемствы, прысвечанае ўшанаванню памяці Катынскай трагедыі. Шчырыя слёзы, эмоцыі... Іду да пасольства. Здалёк заўважыла чырвона-белыя кветкі, агеньчыкі свечак, мноства ахопленых спачуваннем людзей. Некаторыя бацькі сюды прыводзілі памаліцца маленькіх дзяцей: «Гэта наш абавязак. Станавіся на каленцы...» Людзей нельга вярнуць. Нельга пераматаць, як стужку на касеце, і штосьці змяніць.

СТАР. 2



Фота БЕЛТА.

белагропромбанк
традиции будущего

### БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 апреля 2010 года

ОТКРЫТОЕ АКЦИОНЕРНОЕ ОБЩЕСТВО «Белагропромбанк»

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт пояснительной записки | 2010 г. | 2009 г. |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | **АКТИВЫ** | | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | | 281 667,8 | 277 229,4 |
| 3 | Средства в Национальном банке | 1102 | | 75 469,5 | 198 943,6 |
| 4 | Ценные бумаги: | 1103 | | 410 073,1 | 1 160 153,2 |
| | для торговли | 11031 | | - | - |
| | удерживаемые до погашения | 11032 | | 6,0 | 4,8 |
| | в наличии для продажи | 11033 | | 410 067,1 | 1 160 148,4 |
| 5 | Кредиты и другие средства в банках | 1105 | | 314 504,2 | 212 793,2 |
| 6 | Кредиты клиентам | 1106 | | 18 797 130,4 | 14 090 147,3 |
| 7 | Долгосрочные финансовые вложения | 1107 | | 128 530,4 | 24 945,6 |
| 8 | Основные средства и нематериальные активы | 1108 | | 495 271,6 | 415 739,5 |
| 9 | Прочие активы | 1109 | | 80 053,9 | 148 184,6 |
| **10** | **ИТОГО активы** | **110** | | **20 582 700,9** | **16 528 136,4** |
| 11 | **ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | | |
| 12 | Средства Национального банка | 1202 | | 2 821 616,3 | 1 663 747,3 |
| 13 | Кредиты и другие средства банков | 1205 | | 3 501 878,6 | 2 128 027,7 |
| 14 | Средства клиентов | 1206 | | 8 956 216,2 | 8 089 714,8 |
| 15 | Ценные бумаги, выпущенные банком | 1208 | | 583 808,9 | 116 802,1 |
| 16 | Прочие обязательства | 1209 | | 120 808,7 | 134 157,9 |
| **17** | **ВСЕГО обязательства** | **120** | | **15 984 328,7** | **12 132 449,8** |
| 18 | **КАПИТАЛ** | | | | |
| 19 | Уставный фонд | 1211 | | 3 878 635,0 | 3 828 633,5 |
| 20 | Эмиссионный доход | 1212 | | - | - |
| 21 | Резервный фонд | 1213 | | 123 689,9 | 41 861,8 |
| 22 | Накопленная прибыль | 1214 | | 354 791,0 | 298 687,4 |
| 23 | Фонд переоценки статей баланса | 1215 | | 241 256,3 | 226 503,9 |
| 24 | ВСЕГО капитал | 121 | | 4 598 372,2 | 4 395 686,6 |
| **25** | **ИТОГО обязательства и капитал** | **12** | | **20 582 700,9** | **16 528 136,4** |
| 26 | **ТРЕБОВАНИЯ И ОБЯЗАТЕЛЬСТВА НА ВНЕБАЛАНСОВЫХ СЧЕТАХ** | | | | |
| 27 | Требования | 1301 | | 23 829 426,3 | 14 197 474,7 |
| 28 | Обязательства | 1302 | | 2 986 209,9 | 3 149 742,0 |

### ОТЧЕТ О ПРИБЫЛИ И УБЫТКАХ на 1 апреля 2010 года

ОТКРЫТОЕ АКЦИОНЕРНОЕ ОБЩЕСТВО «Белагропромбанк»

(в миллионах белорусских рублей)

| № п.п. | Наименование статьи | Символ | Пункт пояснительной записки | 2010 г. | 2009 г. |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | | 707 952,2 | 468 142,3 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | | 386 644,5 | 343 908,3 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | | 321 307,7 | 124 234,0 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | | 57 822,9 | 50 835,2 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | | 7 667,5 | 5 009,9 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | | 50 155,4 | 45 825,3 |
| 7 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 203 | | 11 156,1 | (-121 368,4) |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | | (-161,6) | (-882,9) |
| 9 | Доход в форме дивидендов | 205 | | 178,0 | - |
| 10 | Чистые отчисления в резервы | 206 | | 245 020,5 | 49 195,6 |
| 11 | Прочие доходы | 207 | | 62 559,0 | 159 176,0 |
| 12 | Операционные расходы | 208 | | 94 602,2 | 91 021,2 |
| 13 | Прочие расходы | 209 | | 18 611,4 | 13 680,2 |
| 14 | Налог на прибыль | 210 | | 32 145,5 | 19 421,6 |
| 15 | ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | 2 | | 54 815,0 | 33 665,4 |

**Председатель Правления** — **С.Н. Румас**

**Главный бухгалтер** — **М.А. Шаповалова**

КОНТАКТ-ЦЕНТР БАНКА 136

Время работы Контакт-Центра Банка:
8.00 - 20.00 - рабочие дни;
8.00 - 18.00 - выходные и праздничные дни.
Звонок со стационарного телефона - бесплатно на территории РБ.
Звонок с мобильного телефона (life:), Velcom, МТС) - по тарифам операторов мобильной связи.

www.belapb.by

*Лицензия на осуществление банковской деятельности от 22.07.2009 № 2, выдана Национальным банком Республики Беларусь.*

## СТАРЫЯ РАЗВІТАЛІСЯ З ЖЫЦЦЁМ...

**84-гадовы пенсіянер з Мінска і яго 79-гадовая жонка пакінулі гэты свет добраахвотна, пра што мужчына паведаміў у перадсмяротнай запісцы.**

Як паведаміў старшы памочнік пракурора горада Мінска Сяргей Балашаў, пенсіянеры жылі ў двухпакаёвай кватэры на вуліцы Стаханаўскай. Тут на ложку сваю нежывую маці і знайшоў сын, а побач ляжала запіска, у якой пенсіянер напісаў, што дапамог жанчыне задыхнуцца з дапамогай падушкі. І патлумачыў, што яны з жонкай дамовіліся скончыць жыццё самагубствам, таму што стаміліся ад жыцця і не бачаць у ім далейшага сэнсу: жанчына працяглы час хварэла і не магла ўстаць з ложка. Акрамя таго, пенсіянер напісаў пра тое, дзе іх пахаваць і ў якім месцы знаходзяцца грошы на апошнюю цырымонію. Між іншым, кватэру ён таксама падрыхтаваў да журботнай падзеі: на бачным месцы знаходзілася адзенне для пахавання, а тэлевізар і люстэркі былі завешаныя. Цела самагубцы было знойдзена ў падвале дома ў пятлі.

## ПАДЛЕТАК ЗДЫМАЎ УЛАСНУЮ СМЕРЦЬ НА ТЭЛЕФОН

**16-гадовы школьнік, вучань 9 класа, на відэакамеру мабільнага тэлефона запісаў тое, як канчае жыццё самагубствам.**

Месцам для суіцыду падлетак выбраў ванны пакой у кватэры на вуліцы Гарадскі вал у Мінску, дзе ён пражываў, паведаміў карэспандэнту «Звязды» старшы памочнік пракурора горада Мінска Сяргей Балашаў. Школьнік усталяваў тэлефон з камерай на крэсла, а на галаву надзеў маску. Цела сына ў пятлі знайшла маці. Дзевяцікласнік не пакінуў перадсмяротнай запіскі, а рахункі з жыццём, як выявілася, спрабаваў звесці і раней: ён рабіў дзве спробы суіцыду, якія, дарэчы, таксама хацеў зафіксаваць на відэакамеру.

**Ігар ГРЫШЫН.**

# ЗАЛЕЖЫЦЬ АД ГАСПАДАРА

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)**

Ёсць сельсаветы (напрыклад, Капацэвіцкі), дзе СВК дае людзям надзелы непасрэдна ў межах сваіх сельскагаспадарчых плошчаў і потым дапамагае з апрацоўкай. Дзесьці выручаюць прыватнікі, у якіх ёсць свая тэхніка. Ёсць ідэя — у кожным аграгарадку пры службе ЖКГ стварыць участкі па аказанні насельніцтву паслуг сельскагаспадарчай скіраванасці. Яны б мелі шмат заказаў.

Напрыклад, Зажэвіцкаму сельсавету пашанцавала. Яго 15 населеных пунктаў месцяцца на землях адразу двух заможных СВК. Адпаведна і падтрымку мясцовым жыхарам і сельскаму выканкаму аказваюць абедзве гэтыя арганізацыі.

Праблем з апрацоўкай прысядзібных участкаў, са зборам малака ад насельніцтва тут няма, расказала старшыня Зажэвіцкага сельскага Савета Надзея ШУНЕВІЧ. З абодвума кіраўнікамі сельскагаспадарчых прадпрыемстваў у яе склаліся выдатныя дзелавыя стасункі.

Як і ўсюды, вялікая ўвага ў сельсавеце надаецца добраўпарадкаванню. Самыя маштабныя работы ў гэтым плане завяршыліся з увядзеннем двух аграгарадкоў (2008 і 2009 гады). А «бягучыя» пытанні вырашаюцца за кошт прыцягнення сродкаў мясцовых жыхароў.

— У нашым бюджэце на гэты год у даходнай частцы запланаваны 5 мільёнаў рублёў так званых добраахвотных унёскаў грамадзян, — тлумачыць Надзея Іванаўна, — але рэальная лічба па выніках года можа быць і большай. Мы актыўна падключаем жыхароў да вырашэння пытанняў добраўпарадкавання. Напрыклад, у Зажэвічах агарадзілі могілкі па схеме «50 на 50» (палову кошту выдаткаваў райвыканкам, палову — нашы людзі). Сёння прыступаем да работ па замене агароджы на могілках у Старых Цярушках (таксама з прыцягненнем сродкаў насельніцтва).

Паводле слоў Надзеі Іванаўны, бюджэт сельвыканкама на гэты год складае 128,4 мільёна рублёў, з якіх 81 мільён — гэта датацыя. Асноўныя крыніцы даходу — зямельны падатак, падатак на нерухомасць з фізічных асобаў, дзяржпошліна, працэнты банка, арэнда зямлі, сродкі самаабкладання. Пэўныя паступленні дае афармленне зямельных участкаў у прыватную маёмасць. Аўкцыёны на тэрыторыі сельсавета не праводзяцца, таму выйсці на самаакупнасць ці панізіць працэнт датацыі пакуль не ўяўляецца магчымым. У такой сітуацыі як ніколі важным становіцца ўменне мясцовай улады працаваць з людзьмі, «дагрукацца» да іх свядомасці і сумлення, заахвоціць вырашаць пытанні добраўпарадкавання — і на сваім асабістым падворку, і на тэрыторыі ўсяго сельсавета.

— Калі летась мы рыхтаваліся да юбілею Салігорскага раёна, то шмат сілаў паклалі на навядзенне парадку. Новыя агароджы ля хатаў цэнтральных вуліц дапамагаў аплаціць раённы бюджэт, але толькі ветэранам і заслужаным жыхарам раёна. Астатнія вяскоўцы мянялі агароджы за свае сродкі. Некаму дапамагалі дзеці. Тым, хто працуе, па нашай просьбе банкі давалі адтэрміноўку выплаты і потым патроху вылічалі з заработнай платы. Затое цяпер вуліцы «зайгралі» па-новаму. Самая аддаленая наша вёска — Абедзямля (30 кіламетраў ад Зажэвічаў), дзе пастаянна пражывае 12 чалавек. Але і там вырашаны асноўныя пытанні добраўпарадкавання. У сельсавеце шмат малых населеных пунктаў, але, якія там часам у людзей прыгожыя агароджы ля хатаў! Усё залежыць ад канкрэтнага гаспадара.

**Інга МІНДАЛЁВА.**

*Салігорскі раён.*

# «ПАВАЖАНАЯ РЭДАКЦЫЯ...»

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)**

Дарэчы, Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 498 «Аб дадатковых мерах па рабоце са зваротамі грамадзян і юрыдычных асобаў», падпісаны яшчэ 15 кастрычніка 2007 г., якраз і быў нацэлены на тое, каб перанесці адказнасць за вырашэнне пытанняў, з якімі звяртаюцца грамадзяне, на мясцовы ўзровень. Менавіта там павінны першапачаткова разглядацца ўсе скаргі і звароты, што датычацца канкрэтнай тэрыторыі і людзей, якія на ёй пражываюць.

Я пацікавілася ў Галіны Салавей, як увогуле вырашаецца ў СВК «Лань—Нясвіж» кватэрнае пытанне.

— У самім аграгарадку Лань — за кошт будаўніцтва катэджаў. Але на тэрыторыі гаспадаркі знаходзіцца 11 населеных пунктаў. У некаторых вёсках засталіся дыхтоўныя дамы, гаспадары якіх або памерлі, або пераехалі ў іншыя месцы. Мы прапануем нашым работнікам — з іх згоды, безумоўна, — выбраць жыллё на свой густ. І купляем для іх гэтыя дамы, — расказала Галіна Станіславаўна. — Пры жаданні людзі могуць заключыць з гаспадаркай дагавор і з цягам часу, уносячы грошы месяц за месяцам, выкупіць жыллё ва ўласнасць. Калі ж не захочуць выкупляць, дом застанецца на балансе гаспадаркі... Кошт такіх дамоў залежыць ад іх месцазнаходжання, ад наяўнасці газаправода. У аграгарадку Лань жыллё, зразумела, будзе каштаваць даражэй.

Галіна Станіславаўна ўзгадала таксама выпадак, калі з гаспадарамі патэнцыяльнага жылля не ўдалося знайсці агульную мову — за дом у самым аддаленым і, да таго ж, негазіфікаваным населеным пункце яны запрасілі ажно 15 тысяч долараў.

— Але моладзь у пераважнай большасці ўсё ж хоча жыць у аграгарадку, у новых, уладкаваных катэджах... Дарэчы, размаўлялі мы наконт катэджа і з Кацярынай Глебавай, але яна ад такога варыянта адмовілася: маўляў, не пацягну. Там, у катэджы, чатыры пакоі, каналізацыя, газавае ацяпленне — а за гэта трэба плаціць. Ды і вонкавы парадак падтрымліваць увесь час давядзецца, што для адзінокай маладой мамы зусім няпроста...

Таму адміністрацыя СВК цалкам вітае варыянты, калі людзі падбіраюць сабе жыллё не толькі ў аграгарадку, але і ў іншых населеных пунктах. Тым больш калі гэта жыллё знаходзіцца побач з месцам іх працы — адразу адпадае праблема з падвозам. Бо вазіць людзей на тую ж невялічкую ферму на трохразовую дойку для СВК эканамічна нявыгадна.

Як ні круці, а сёння гаспадарка зацікаўлена ў сваіх работніках не менш, а можа нават і больш, чым яны зацікаўленыя ў ёй. А значыць, свой дом у той жа Кацярыны Глебавай абавязкова будзе, як з'явіўся ён нядаўна ў сям'і маладых спецыялістаў — заатэхніка і ветурача (гаспадарка набыла яго за 1,5 тысячы долараў). Не катэдж, праўда, але асобнае жыллё, што для маладой сям'і вельмі важна.

...А тым, хто, не разабраўшыся, хапаецца за аркуш паперы, каб напісаць скаргу ў чарговую «інстанцыю», раю больш уважліва паглядзець вакол сябе. Дзесьці непадалёку вы абавязкова ўбачыце ўстанову (будынак канторы, адміністрацыі, выканкама) з шыльдачкай, на якой пазначаны графік прыёму грамадзян. Не палянуйцеся зайсці. Магчыма, менавіта там вы атрымаеце інфармацыю, якая пазбавіць вас ад неабходнасці «дабівацца справядлівасці». Самы правільны шлях не абавязкова азначае самы доўгі.

**Наталля КАРПЕНКА.**

# САЦЫЯЛЬНА-НЕБЯСПЕЧНЫМІ НЕ ЗНАЧАЦЦА...

## А ДЗЕЦІ ГІНУЦЬ, ЗБІВАЮЦЦА, ПАКІДАЮЦЦА БЕЗ НАГЛЯДУ І ХАРЧАВАННЯ



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Пракуратура Гродзенскай вобласці праверыла выкананне заканадаўства па ахове жыцця і здароўя няпоўнагадовых, якія апынуліся ў экстрэмальнай сітуацыі, сталі ахвярамі злачынстваў, жорсткасці і гвалту. Вось толькі некаторыя факты для роздуму і, зразумела, дзеянняў зацікаўленых дзяржаўных органаў, каб гэтага не паўтарылася.**

### Дзіма загінуў у агні...

У канцы мінулага года ў вёсцы Тоўсцікі Мастоўскага раёна загінуў у пажары пяцігадовы Дзіма Чахуноў. Прычына трагедыі банальная — дзіцячае свавольства з агнём.

Пракуратурай устаноўлена, што сям'я Чахуновых жыла ў гэтай вёсцы з ліпеня мінулага года, бацькоў хлопчыка прынялі на працу ў ЗАТ «Гудзевічы» і забяспечылі домам. Праўда, дагавор найму жылога памяшкання не заключаўся, і ніхто з членаў сям'і па месцы жыхарства зарэгістраваны не быў. Умовы жыцця малалетняга ўпаўнаважанымі дзяржаўнымі органамі не вывучаліся, пытанне аб яго своечасовым накіраванні ў дашкольную ўстанову не вырашалася. На момант пажару Дзіма знаходзіўся адзін без нагляду дарослых...

Ад апёкаў, і не толькі ад іх, пацярпеў і чатырохгадовы Ілья Платонаў. Гродзенскім райаддзелам міліцыі заведзена крымінальная справа ў дачыненні да яго айчыма П. Януцэвіча. Гэты вырадак нанёс малому каля шасці ўдараў рукамі ды яшчэ дзесяць тэрмічных апёкаў запалкамі па розных частках цела. Сапраўдны садызм!

Прычым следствам устаноўлена, што ў Ілы і раней былі цялесныя пашкоджанні, пра якія было вядома і фельчару, і загадчыцы Капцёўскай амбулаторыі. Аднак праваахоўныя органы аб гэтым не інфармаваліся. Больш за тое, адміністрацыяй Капцёўскай сярэдняй школы былі сфальсіфікаваныя дакументы аб прызнанні, што Ілья Платонаў знаходзіцца ў сацыяльна-небяспечным становішчы.

### Нараджэнне дзяцей... не зарэгістравалі

Неверагодна, але менавіта такі факт выяўлены пракурорскай праверкай у Дзятлаўскім раёне.

24 лістапада мінулага года ў райаддзел міліцыі паступіла інфармацыя з прыёмнага пакоя Цэнтральнай раённай бальніцы: дастаўлены Дзіма Раеўскі, якому няма яшчэ і трох месяцаў. У яго чэрапна-мазгавая траўма, пераломы касцей чэрапа. Напярэдадні гэту сям'ю, якая жыве ў вёсцы Руда Яворская, наведала фельчар мясцовага ФАПа і выявіла, што ў Дзімы павышаная тэмпература цела, прапанавала яго шпіталізаваць. А ў бальніцы высветлілася, што ў хлопчыка траўма галавы.

Што ж здарылася? У сям'і Раеўскіх чацвёра дзяцей: Данііл, 2006 года нараджэння, Настасся, 2007 г.н., і малыя — блізняты Дзмітрый і Павел, 2009 г.н. Як паказала праверка, 22 лістапада пасля 17 гадзін у доме знаходзіліся дзеці разам з бацькам і ягоным братам, а маці была на працы. І так атрымалася, што Насця сцягнула малога з ложка і ён зваліўся на падлогу, пасля чаго на галаве з'явілася прыпухласць, а з носу пайшла кроў. Аднак толькі 24 лістапада Дзіму даставілі ў бальніцу.

Тады, у ходзе праверкі, і было ўстаноўлена, што нараджэнне Дзімы і яго брата Паўла... не зарэгістравана ў органах ЗАГС. Чаму? Аказваецца, у маці няма грамадзянскага пашпарта, паколькі яна, узяўшы новы шлюб, змяніла прозвішча. Па гэтай прычыне жанчына не атрымала дзяржаўную дапамогу ў сувязі з нараджэннем сыноў-блізнятаў. А яе муж нідзе не працуе, сям'я жыве, а дакладней, існуе за кошт аліментаў, якія Раеўская атрымлівае на выхаванне дачкі Насці. І маці, і бацька дзяцей злоўжываюць спіртным.

Відавочна, што гэта сям'я з'яўляецца сацыяльна-небяспечнай, аднак толькі 30 кастрычніка, незадоўга да бяды з Дзімам, яе паставілі на ўлік. Пасля чаго, робіць выснову пракуратура, ні сельвыканкам, ні мясцовы дзіцячы садок-сярэдняя школа, ні сельгаскааператыў, дзе фактычна працавала Раеўская, не зрабілі ніякіх захадаў па абароне правоў дзяцей. Нікога не цікавіла, што двайняты не зарэгістраваныя ў ЗАГСе, што маці з-за адсутнасці пашпарта не атрымала ніводнай выплаты ад дзяржавы, і выйшла на працу, пакінуўшы чацвярых малалетніх дзетак на бацьку-алкаголіка.

І толькі пасля атрымання Дзімам траўмы пастановай камісіі па справах няпоўнагадовых у той жа дзень, 24 лістапада, усе чацвёра дзяцей былі адабраныя ў бацькоў.

### Дзеці дома, а маці... у загуле

А вось што ўбачылі супрацоўнікі пракуратуры ў верасні мінулага года, пабываўшы разам з прадстаўнікамі зацікаўленых органаў у вёсцы Даўгялы Воранаўскага раёна, дзе на ўтрыманні тутэйшай жыхаркі Я. Кіндэр — чацвёра малалетніх дзяцей (1999, 2003, 2005 і 2007 г.н.). Яны, напаўраздзетыя, знаходзіліся, нягледзячы на халоднае надвор'е, на вуліцы. А ў хаце — антысанітарныя ўмовы, дзяцей пакінулі без ежы. Хіба ж можна давяраць сужыцелю Кіндэр, які сустрэў удзельнікаў праверкі са значнымі цялеснымі пашкоджаннямі на твары. А дзе ж маці гэтых дзетак? Па словах сужыцеля, яна ўжо суткі адсутнічала дома.

Дык няўжо гэта не сацыяльна-небяспечнае становішча? Аднак няпоўнагадовыя дзеці на такім уліку не значыліся. І гэта — пасля трагічнай гібелі на пажары ў 2003 годзе аднаго з дзяцей Кіндэр. А таксама пасля таго, як яшчэ ў красавіку 2008 года жыхары вёскі паведамлялі, што маці чацвёра сутак адсутнічала дома, а дзеці былі пакінутыя без нагляду — галодныя, у халодным памяшканні. І спрабавалі распаліць печ...

Па выніках праверкі органамі пракуратуры Гродзенскай вобласці ўнесена 18 прадстаўленняў кіраўнікам дзяржаўных органаў, дзе пастаўлена пытанне аб дысцыплінарнай адказнасці вінаватых асобаў. У Генеральную пракуратуру накіраваныя прапановы па ўдасканаленні заканадаўства па абароне дзяцей, якія аказаліся ў экстрэмальнай жыццёвай сітуацыі.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**

# Ці патрэбныя вяскоўцам ТРЭНАЖОРЫ?

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)**

Размовы аб тым, што з-за нізкай плацежаздольнасці жыхары сельскагаспадарчых рэгіёнаў не могуць забяспечыць варты попыт, не вытрымалі праверку рэаліямі. Як высветлілася, галоўнае аказалася ў іншым — пошуку «свайго» кліента і новых відах дзейнасці.

— Калі раней мы заходзілі ў пункт пракату, то маглі пабачыць халадзільнікі, тэлевізары, посуд — вось, напэўна, і ўсё, — кажа дырэктар Вілейскага раённага камбіната бытавога абслугоўвання Аляксандра Салава. — Але час змяніўся кардынальна: жыхары раёнаў не хочуць адчуваць сябе горшымі, чым жыхары буйных гарадоў. Адсюль і змены: пункты пракату прапануюць мыючыя пыласосы, палаткі, спальныя мяшкі, ролікі, скейты. Прычым прыклады можна прыводзіць і надалей. Так, адначасова з камп'ютарным фота ў нас прапануецца ламінаванне, брашураванне і ксеракопія. Пашыраецца пералік стрыжак і завівак — словам, ёсць імкненне ні ў чым не адстаць ад сталіцы.

Асобная гаворка аб уласнай швейнай вытворчасці. Безумоўна, сюды па традыцыі прыносяць рэчы ў рамонт. Але разам з гэтым атэлье наладзіла ўласную вытворчасць трыкатажных вырабаў, а таксама пачало актыўны пошук самых розных заказаў — тут нават шылі чахлы для авіяцыйнай тэхнікі.

— Пры гэтым з-за нізкіх цэнаў на паслугі мы не адчуваем канкурэнцыі з боку Маладзечна, — заўважае Аляксандра Салава. — А што ж да прадпрымальнікаў, то колькасць недзяржаўных прадпрыемстваў у гэтай сферы сапраўды вялікая. Вось толькі даводзіцца канстатаваць, што цікавіць прыватнікаў толькі Вілейка. У вёскі ж ніхто з іх не пайшоў.

### Заўтра будзе больш?

За апошні час раённы камбінат бытавога абслугоўвання змог укласці ў рамонты КПП у аграгарадках больш за 200 млн рублёў уласных сродкаў. З улікам ранейшых праблем гэта лічба — больш чым значная. Разам з тым, нельга не заўважыць, што «эканоміка» гэтай сферы заўсёды была спецыфічнай. Адлегласць ад Вілейкі да аддаленых прыёмных пунктаў складае паўсотні кіламетраў, што ў сваю чаргу вядзе да вялікіх транспартных выдаткаў. Разлічваць на звышпрыбытак тут не выпадае.

— Вельмі добра, што да бытавога абслугоўвання павярнулася дзяржава, нам дадзеныя ўсе прэферэнцыі — вызваленне ад падатку на дабаўленую вартасць, ільготы па зямельным падатку, частковая кампенсацыі стратаў пры аказанні паслуг на вёсцы, — адзначае Аляксандра Салава. — Але пакуль бянтэжыць адно: тэрмін прадастаўлення падтрымкі заканчваецца сёлета, а вось што будзе далей — невядома. Зразумела, што час цяпер няпросты, і тым не менш мы пераканаНЫЯ, што без пралангацыі тут не абысціся. Бытавое абслугоўванне зусім нядаўна стала адраджацца, і адмовіцца ад дапамогі яму сёння — значыць, несці нашмат большыя выдаткі заўтра.

**Сяргей ГРЫБ.**

*Вілейскі раён.*


## ОАО «БЕЛНИИЛИТ»

*220118, г. Минск, ул. Машиностроителей, 28, УНП 100023492*

**ИНФОРМАЦИЯ**

**о результатах финансово-хозяйственной деятельности открытого акционерного общества «БЕЛНИИЛИТ» за 2009 год**

| Наименование показателя | Код строки | За отчетный период, млн руб. | За аналогичный период прошлого года, млн руб. |
|---|---|---|---|
| 1. Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг | 010 | 9842 | 15319 |
| 2. Налоги и сборы, включаемые в выручку от реализации товаров, продукции, работ, услуг | 011 | 763 | 1171 |
| 3. Себестоимость реализованных товаров, продукции, работ, услуг | 030 | 4459 | 8796 |
| 4. Валовая прибыль | 040 | 4620 | 5352 |
| 5. Прибыль (убыток) от реализации товаров, продукции, работ, услуг | 070 | 1325 | 2019 |
| 6. Прибыль (убыток) от операционных доходов и расходов | 120 | -15 | -27 |
| 7. Прибыль (убыток) от внереализационных доходов и расходов | 160 | -339 | -299 |
| 8. Прибыль (убыток) | 200 | 971 | 1693 |
| 9. Чистая прибыль (убыток) | 300 | 326 | 1026 |

10. Количество акционеров, всего – 51, в том числе: юридических лиц – 1, физических лиц – 50.

**11. Информация о дивидендах и акциях:**

| Наименование показателя | Единица измерения | За отчетный период | За аналогичный период прошлого года |
|---|---|---|---|
| Начислено на выплату дивидендов в данном отчетном периоде | млн руб. | 32,6 | - |
| Дивиденды, приходящиеся на одну акцию (включая налоги) | рублей | 33 | - |
| Обеспеченность акции имуществом | тыс. руб. | 8,8 | - |
| Количество простых акций, находящихся на балансе Общества | штук | - | - |

**12. Информация о задолженности:**

| Наименование показателя | Единица измерения | За отчетный период | За аналогичный период прошлого года |
|---|---|---|---|
| Просроченная дебиторская задолженность | млн руб. | 117 | - |
| Просроченная кредиторская задолженность | млн руб. | - | - |

13. Среднесписочная численность работающих (человек) – **159.**

14. Основной вид деятельности: **разработка технологий и оборудования для литейного производства.**

**Бухгалтерский баланс за 2009 год по состоянию на 01.01.2010 года**

| Наименование показателя | Код строки | На начало года, млн руб. | На конец года, млн руб. |
|---|---|---|---|
| **АКТИВ** | | | |
| Внеоборотные активы | 190 | 8852 | 9691 |
| Оборотные активы | 290 | 5730 | 5680 |
| **Баланс** | **300** | **14582** | **15371** |
| **ПАССИВ** | | | |
| Капитал и резервы | 490 | 11138 | 12048 |
| Долгосрочные обязательства | 590 | - | - |
| Краткосрочные обязательства | 690 | 3444 | 3323 |
| **Баланс** | **700** | **14582** | **15371** |

**Директор** **А.П. Мельников**

**Главный бухгалтер** **Н.В. Ванзонок**


# ЯКІ ТЫ, ФЕРМЕРСКІ ХЛЕБ?

**Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання абнародавала статыстычную інфармацыю адносна працэсу развіцця ў краіне сялянскіх (фермерскіх) гаспадарак. Так, у працэсе рэформаў, пачынаючы з 1991 года і па сёння, у Беларусі было арганізавана больш за 6 тысяч такіх гаспадарак і каля 4 тысяч спынілі сваю дзейнасць.**

**ПА 61 ГЕКТАРУ НА ГАСПАДАРКУ**

Па стане на пачатак гэтага года ў краіне налічвалася 2045 сялянскіх (фермерскіх) гаспадарак. У тым ліку ў Брэсцкай вобласці — 413, у Віцебскай — 329, у Гомельскай — 258, у Гродзенскай — 306, у Мінскай — 471, у Магілёўскай вобласці — 268 гаспадарак. За імі агулам замацавана 124,5 тысячы гектараў зямлі. У сярэднім на адну фермерскую гаспадарку прыпадае 61 гектар (гэты паказчык вагаецца, напрыклад, ад 41 гектара ў Брэсцкай вобласці да 108 гектараў у Магілёўскай).

На працягу мінулага года было створана 147 сялянскіх (фермерскіх) гаспадарак, у той жа час 97 спынілі сваю дзейнасць.

**З СЯРЭДНЯЙ СПЕЦЫЯЛЬНАЙ, ДА 49 ГАДОЎ**

Калі гаварыць пра ўзровень адукацыі і ўзрост кіраўнікоў сялянскіх (фермерскіх) гаспадарак, то вышэйшую адукацыю маюць 36 працэнтаў з іх, сярэднюю спецыяльную — 43 працэнты, сярэднюю — 19,4 працэнта, няпоўную сярэднюю — 1,6 працэнта.

Па ўзроставым складзе кіраўнікі гаспадарак прадстаўлены наступным чынам. Да 30 гадоў — 5 працэнтаў, ад 30 да 39 гадоў — 21 працэнт, ад 40 да 49 гадоў — 47 працэнтаў, ад 50 да 59 гадоў — 21 працэнт, узрост 60 гадоў і больш маюць 6 працэнтаў фермераў. Такім чынам, можна ўявіць сабе сярэднестатыстычны «партрэт» фермера: чалавек з дыпломам колішняга тэхнікума ва ўзросце да 49 гадоў.

Наколькі наяўнасць таго ці іншага ўзроўню канкрэтнага фермера паўплывала на спецыялізацыю яго гаспадаркі, не гаворыцца. Пэўныя ўскосныя высновы можна зрабіць па наступных фактах: для 80 працэнтаў сялянскіх (фермерскіх) гаспадарак асноўным накірункам з'яўляецца раслінаводства.

**НАДОІ — НІЖЭЙ ЗА СЯРЭДНЕРЭСПУБЛІКАНСКІ ЎЗРОВЕНЬ**

У 2009 годзе сялянскімі (фермерскімі) гаспадаркамі было выраблена 111,2 тысячы тон збожжа (што складае 98,5 працэнта да ўзроўню папярэдняга года), бульбы — 115,5 тысячы тон (88,1 працэнта), агародніны — 128,6 тысячы тон (97,8 працэнта).

Ураджайнасць у гаспадарках склала: па збожжу — 30,7 цэнтнера з гектара, што ніжэй за сярэднерэспубліканскую па ўсіх катэгорыях гаспадарак на 2,6 цэнтнера з гектара; па бульбе — 182 цэнтнеры з гектара (на 4 цэнтнеры з гектара); па агародніне — 211 цэнтнераў з гектара (на 31 цэнтнер з гектара).

Надоі на карову ў сельскіх (фермерскіх) гаспадарках летась склалі 3944 кілаграмы, што на 747 кілаграмаў ніжэй за сярэднерэспубліканскі ўзровень (ва ўсіх катэгорыях). У гаспадарках па стане на пачатак 2010 года ўтрымлівалася 10,1 тысячы галоў буйной рагатай жывёлы, у тым ліку 3,8 тысячы кароў, 34,9 тысячы свіней, 3,5 тысячы авечак і 0,6 тысячы коней.

**ТРАКТАР У ФЕРМЕРА НЕ ПАПРОСІШ...**

Увогуле, згодна са статыстычнымі звесткамі, 1227 сялянскіх (фермерскіх) гаспадарак (60 працэнтаў) ад іх наяўнасці на 1 студзеня гэтага года не трымалі буйной рагатай жывёлы. Каля 36 працэнтаў гаспадарак не маюць трактароў, 64 працэнты — грузавых аўтамабіляў.

Удзельная вага сельскагаспадарчай прадукцыі, атрыманай ад сялянскіх (фермерскіх) гаспадарак у агульным аб'ёме яе вытворчасці па краіне застаецца нязначнай і складае меней за 2 працэнты. У тым ліку 0,2 працэнта па малаку, 0,5 працэнта па мясу, 0,04 працэнта па яйках, 1,3 працэнта па збожжы, 1,6 працэнта па бульбе, 5,6 працэнта — па агародніне.

У адпаведнасці з Законам Рэспублікі Беларусь «Аб сялянскай (фермерскай) гаспадарцы», фермерскім гаспадаркам, у якіх выручка ад рэалізацыі выробленай ці выробленай і перапрацаванай імі прадукцыі ўласнай вытворчасці раслінаводства (акрамя кветак і дэкаратыўных раслін), жывёлагадоўлі (акрамя пушной зверагадоўлі), рыбаводства і пчалаводства складае не менш за 50 працэнтаў ад агульнай выручкі за папярэдні фінансавы год, а таксама толькі што створаным фермерскім гаспадаркам (на працягу першага года з дня іх стварэння) аказваецца дзяржаўная падтрымка за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту.

**НА ПЕРШАСНАЕ ЎЛАДКАВАННЕ — 1,2 МІЛЬЯРДА**

Указаным гаспадаркам павінна аказвацца дзяржаўная падтрымка ў наступных сферах. Па матэрыяльна-тэхнічным забеспячэнні, набыцці (на ўмовах лізінгу), рамонце і тэхнічным абслугоўванні сельскагаспадарчай тэхнікі і абсталявання; меліярацыі земляў і вапнаванні глебы; ахове раслін, насенняводстве; ветэрынарнай і племяннай справах і ў іншых сферах нароўні з іншымі вытворцамі сельскагаспадарчай прадукцыі.

Так, летась са сродкаў рэспубліканскага бюджэту на першаснае ўладкаванне сялянскіх (фермерскіх) гаспадарак было накіравана 1,9 мільярда рублёў. Сёлета прадугледжана накіраваць пад такія ж мэты 1,2 мільярда рублёў.

**НЯДАЎНА малады калега паскардзіўся: звярнуўся ў 33-ю мінскую паліклініку, дзе абслугоўваюцца студэнты ўсіх сталічных ВНУ, са звычайнай прастудай, а ўрач парэкамендавала яму лячыць ВРЗ імпартным антыбіётыкам па цане... 50 тысяч рублёў за ўпакоўку. Праўда, убачыўшы разгубленасць хлопца пасля агучанай лічбы, ласкава так пацікавілася: «Дарагі для вас прэпарат? Ну добра, выпішу больш танны...» Зразумела, што ні дарагі, ні танны антыбіётык наш калега купляць не стаў, бо «рэдакцыйныя медыкі» адукавалі яго ў гэтым пытанні: вострае віруснае захворванне антыбіётыкамі не лечыцца. А прымаць антыбіётыкі ў якасці прафілактыкі магчымых ускладненняў тое ж самае, што паліць з гарматы па вераб'ях. Да таго ж ёсць рэальная пагроза стаць у перспектыве неадчувальным да ўздзеяння жыццёва важных антыбіётыкаў. А днямі зноў паскардзілася каляжанка, маўляў, лячылася ад прастуды па рэкамендацыі ўрача імпартным антыбіётыкам, вельмі нятанным, давялося заплаціць 40 тысяч рублёў за ўпакоўку. Дзіўная рэч, чаму галоўнай «зброяй» супраць прастуды ў нашых урачоў сталі менавіта антыбіётыкі? Раней не менш актыўна прасоўваліся разнастайныя БАДы... Ці не таму, што рэкамендацыі, якія агучваюць урачы, стымулююцца з боку фармацэўтычных кампаній? Напэўна, гісторыі пра тое, як урач рэкамендаваў набыць той ці іншы дарагі замежны прэпарат, могуць прыгадаць многія нашы чытачы. А на пытанне, чаму вы не прызначаеце беларускі аналаг, нярэдка чуеш у адказ ад урача ці фармацэўтычнага работніка: «Эфектыўны прэпарат быць танным не можа».**





У суседняй Расіі ўсур'ёз занепакоіліся такім становішчам спраў. І нядаўна на разгляд у расійскі ўрад быў накіраваны законапраект, які прадугледжвае пакаранні для ўрачоў і аптэчных работнікаў за рэкамендацыю лекаў і медыцынскай тэхнікі па дамоўленасці з кампаніямі-вытворцамі. Як вынікае з тлумачальнай запіскі да законапраекта, урачы, якія знаходзяцца ў фармальных ці нефармальных адносінах з фармацэўтычнай кампаніяй і яе прадстаўнікамі, могуць парушаць прынцыпы непрадузятасці і патрабаванні медыцынскай этыкі, у выніку чаго церпяць інтарэсы пацыентаў. У сувязі з гэтым аўтары законапраекта прапануюць забараніць медыцынскім і фармацэўтычным работнікам прымаць ад вытворцаў лекаў і медыцынскай тэхнікі падарункі, грашовыя сродкі, а таксама аплату забаў, адпачынку і праезду да месца адпачынку. Акрамя таго, урачы будуць абавязаныя інфармаваць пацыента аб прыблізным кошце лякарства. Прапануецца таксама забараніць выпіску рэцэптаў на запоўненых фірмай ці рэкламных бланках, выкарыстанне ў аптэках і медустановах рэкламнай прадукцыі з лагатыпамі медыцынскай прадукцыі і сустрэчы з прадстаўнікамі фармацэўтычных кампаній.

У Міністэрстве аховы здароўя нашай краіны таксама не хаваюць сваёй заклапочанасці сітуацыяй, звязанай з прасоўваннем лекавых сродкаў. Асобныя кампаніі ці прадстаўнікі замежных кампаній, што працуюць на беларускім фармацэўтычным рынку, дапускаюць шэраг парушэнняў этычнага характару, якія выражаюцца ў прамым ці ўскосным стымуляванні ўрачоў і фармацэўтычных работнікаў. Дарэчы, звышактыўнасць прадстаўнікоў фармацэўтычных кампаній мела раней і яшчэ адзін малапрыемны бок: пацыенты пачалі скардзіцца ў міністэрства на тое, што візіты прадстаўнікоў фарміндустрыі адбіраюць ва ўрача той час, які медыцынскі работнік павінен быў выдзеліць для стасункаў з пацыентамі. Таму летась Міністэрства аховы здароўя Беларусі было вымушана ўпарадкаваць наведванне арганізацый аховы здароўя прадстаўнікамі фармацэўтычных фірмаў...

У пачатку 2008 года ў сценах Міністэрства аховы здароўя прайшла рэспубліканская нарада, на якой было прынятае рашэнне аб стварэнні Правілаў належнага прасоўвання фармацэўтычнымі кампаніямі лекавых сродкаў у Рэспубліцы Беларусь. А да моманту зацвярджэння гэтых правілаў усім вытворцам і пастаўшчыкам лекавых сродкаў было рэкамендавана захоўваць палажэнні Кодэкса маркетынгавай практыкі Асацыяцыі міжнародных фармацэўтычных вытворцаў, які ўхваліла Міністэрства аховы здароўя.

Кодэкс — гэта своеасаблівы звод правілаў і нормаў, якія вызначаюць адказнасць прадстаўнікоў фармацэўтычных кампаній, урачоў і фармацэўтаў не толькі адзін перад адным, але і перад пацыентам. Асацыяцыяй міжнародных фармацэўтычных вытворцаў быў распрацаваны і перададзены ў Міністэрства аховы здароўя праект Правілаў належнага прасоўвання лекаў. Аднак ён быў толькі прыняты да ведама. Затое ў галоўным медыцынскім ведамстве быў падрыхтаваны праект пастановы Міністэрства аховы здароўя «Аб інфармаванні медыцынскіх і фармацэўтычных работнікаў, арганізацый аховы здароўя аб зарэгістраваных у Рэспубліцы Беларусь лекавых сродках, вырабах медыцынскага прызначэння і медыцынскай тэхнікі». Яго тэкст змешчаны для публічнага абмеркавання на сайце міністэрства. Прывядзём толькі некаторыя з палажэнняў, якія ўключаны ў гэты дакумент.

Звесткі аб лекавых сродках павінны быць дакладнымі, праўдзівымі, сучаснымі і даказальнымі. Сцвярджэнне «новае» ў дачыненні да лекавага сродку можна выкарыстоўваць толькі тады, калі пасля дзяржаўнай рэгістрацыі ў Рэспубліцы Беларусь першага лекавага сродку, які змяшчае гэтае дзейнае рэчыва, прайшло не больш як 3 гады. Вусныя паведамленні і інфармацыйныя матэрыялы не павінны змяшчаць сцвярджэнняў, што тэрапеўтычны эфект ад прыёму лекавага сродку з'яўляецца абсалютна гарантаваным або пра тое, што стан здароўя пацыента без прыёму гэтага лякарства можа пагоршыцца. **Інфармацыйныя матэрыялы не павінны змяшчаць указанняў на тое, што эфектыўнасць і (ці) бяспека лекавага сродку з'яўляецца наступствам прыроднага паходжання яго кампанентаў і звестак, якія прама ці ўскосна спрыяюць рэалізацыі лекавага сродку ці яго прасоўванню на рынак, а таксама неправераных звестак.**

> **Інфармацыйныя матэрыялы не павінны змяшчаць указанняў на тое, што эфектыўнасць і (ці) бяспека лекавага сродку з'яўляецца наступствам прыроднага паходжання яго кампанентаў, і звестак, якія прама ці ўскосна спрыяюць рэалізацыі лекавага сродку ці яго прасоўванню на рынак.**

Не дапускаюцца індывідуальныя наведванні медыцынскімі прадстаўнікамі медыцынскіх і фармацэўтычных работнікаў падчас прыёму пацыентаў, урачэбных абходаў і водпуску лекавых сродкаў насельніцтву. Не дапускаецца распаўсюджванне ў арганізацыях аховы здароўя інфармацыі аб лекавых сродках у выглядзе надрукаваных друкарскім спосабам рэцэптаў урача з пазнакай у іх гандлёвых назваў лекавых сродкаў, а таксама інфармацыі аб медыцынскай прадукцыі, якая не зарэгістравана ў Рэспубліцы Беларусь.

Асобнай увагі заслугоўвае наступны пункт: «Не дапускаецца арганізацыя любых акцый, накіраваных на ўстанаўленне матэрыяльнай залежнасці медыцынскіх і фармацэўтычных работнікаў ад прызначэння ці рэкамендацыі імі пацыентам медыцынскай прадукцыі канкрэтных вытворцаў». Праўда, як будзе дзейнічаць гэты пункт, калі дакумент будзе прыняты, на жаль, невядома. Ніякіх механізмаў яго рэалізацыі ў пастанове не ўтрымліваецца.

Меркаваннем наконт праекта пастановы Міністэрства аховы здароўя мы пацікавіліся ў **выканаўчага дырэктара Асацыяцыі міжнародных фармацэўтычных вытворцаў (AIPM) Аляксея СЫЧОВА.**

— Правілы належнага прасоўвання лекавых сродкаў айчыннымі і замежнымі прадстаўнікамі, якія мы перадалі ў міністэрства раней, мелі, хутчэй, дэкларатыўны, а не абавязковы характар, таму рашэнне замацаваць ключавыя моманты ў Пастанове Міністэрства аховы здароўя цалкам апраўдана, — паведаміў журналісту «Звязды» Аляксей Сычоў. — І хоць праект пастановы рыхтаваўся работнікамі Міністэрства аховы здароўя без нашага ўдзелу, у нас ёсць магчымасць далучыцца да яго абмеркавання і ўзяць удзел у падрыхтоўцы канчатковага яго варыянту.

Хачу заўважыць, што ў дакуменце Міністэрства аховы здароўя ўводзіцца новае паняцце «медыцынскі прадстаўнік». Такой спецыяльнасці няма ў Класіфікатары прафесій і спецыяльнасцяў. Згодна з дакументам Міністэрства аховы здароўя, толькі медыцынскія прадстаўнікі могуць выконваць работу па інфармаванні медыцынскіх і фармацэўтычных работнікаў аб леках. Прычым да медыцынскіх прадстаўнікоў прад'яўляюцца наступныя патрабаванні: наяўнасць у іх вышэйшай медыцынскай ці фармацэўтычнай адукацыі, кваліфікацыйнай катэгорыі і (ці) вучонай ступені, спецыялізацыя ў галіне фармакалогіі і клінічнай фармакалогіі або ў галіне медыцыны па профілі прымянення лекавых сродкаў, па якіх ажыццяўляецца інфармаванне. І, напэўна, самы спрэчны момант — гэта наяўнасць сертыфіката, які пацвярджае праходжанне курсаў павышэння кваліфікацыі па фармакалогіі і клінічнай фармакалогіі або ў галіне медыцыны па профілі прымянення лекавых сродкаў на працягу апошніх трох гадоў. Паколькі такіх курсаў канкрэтна для медыцынскіх прадстаўнікоў на сёння не арганізавана, атрымліваецца, што і медыцынскімі прадстаўнікамі ніхто працаваць не зможа. Ёсць у праекце і пэўныя неадпаведнасці Закону Рэспублікі Беларусь «Аб рэкламе».

А вось намер Міністэрства аховы здароўя ўпарадкаваць работу медыцынскіх прадстаўнікоў у арганізацыях аховы здароўя мы цалкам падтрымліваем і нават вітаем, бо хаатычныя перамяшчэнні прадстаўнікоў фармацэўтычных кампаній адцягваюць увагу ўрачоў, перашкаджаюць пацыентам у атрыманні медыцынскай дапамогі і раздражняюць людзей. Таму іх візіты ў медыцынскія ўстановы трэба сістэматызаваць. Мы, напрыклад, вывучалі вопыт суседняй Літвы. Там кожнай фармацэўтычнай кампаніі выдзяляецца пэўная квота на наведванне той ці іншай арганізацыі аховы здароўя. Скажам, нейкую канкрэтную ўстанову можна наведваць не часцей чым два-тры разы ў месяц. У прыёмнай кіраўніка ўстановы аховы здароўя ляжыць журнал, дзе фіксуецца факт візіту фармацэўтычнага прадстаўніка, яму выдаецца адпаведны бэдж, і той вядзе сваю «асветніцкую работу» з кімсьці з медперсаналу. Работу фармацэўтычных прадстаўнікоў трэба накіраваць у цывілізаванае рэчышча — гэта і ў нашых інтарэсах. У кампаній, што ўваходзяць у Асацыяцыю міжнародных вытворцаў, дзейнічаюць даволі жорсткія патрабаванні да работы фармацэўтычных прадстаўнікоў: тыя ведаюць, якую інфармацыю і ў якой форме трэба даносіць да медыцынскіх работнікаў. Галоўнае — рабіць гэта якасна. Аднак не ўсе ігракі на фармацэўтычным рынку прытрымліваюцца этычных нормаў, не ва ўсіх ёсць адпаведная прафесійная падрыхтоўка... Мы неаднаразова звярталіся да іншых удзельнікаў фармацэўтычнага рынку з прапановай далучыцца да Кодэкса маркетынгавай практыкі Асацыяцыі міжнародных фармацэўтычных вытворцаў, аднак зацікаўленасці з іх боку не назіраем.

А напрыканцы хацелася б агучыць вынікі апытання, прыведзеныя на сайце канцэрна «Белбіяфарм». На пытанне, што для вас галоўнае пры выбары лекавага сродку, 23 працэнты ўдзельнікаў адказалі, што арыентуюцца на парады ўрача, 12 працэнтаў абапіраюцца на парады работнікаў аптэкі, 34 працэнты звяртаюць увагу на фірму-вытворцу, 19 працэнтаў арыентуюцца на даступную цану і толькі для 3 працэнтаў мае значэнне зручная і прыцягальная ўпакоўка лекавага прэпарата.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

Погляд

## НА КАГО РАЗЛІЧАНЫ ТУРЫСТЫЧНЫ МАРШРУТ «БЕЛАРУСКІЯ АКВАРЭЛІ»?

***На выставе «Адпачынак-2010» «ЦэнтрКурорт» прэзентаваў новы турыстычны маршрут па Беларусі, які каштуе, як пуцёўка ў Турцыю***

«Беларускія акварэлі» — шасцідзённы экскурсійны тур па Беларусі з харчаваннем і пражываннем у гасцініцы. У першы дзень гэта экскурсія па Мінску (Траецкае прадмесце, плошча Перамогі і Якуба Коласа, Мінск-Арэна і Нацыянальная бібліятэка), а пасля наведванне Вялікага тэатра оперы і балета. На другі — Белавежская пушча, фальварак беларускага Дзеда Мароза. Тут жа вячэра пад акампанемент фальклорнага калектыву. На наступны дзень турыстам прапаноўваецца экскурсія ў Брэсцкую крэпасць, Музей выратаваных каштоўнасцяў, археалагічны музей «Бярэсце» і пераезд у нацыянальны парк «Прыпяцкі». Назаўтра гасцей чакае «Сафары-парк», абед-пікнік на лясной палянцы і прагулка на цеплаходзе па Прыпяці. На пяты дзень турыстам пакажуць Тураў з яго помнікамі, знакамітым крыжом, які расце, і г.д. У апошні дзень гасцей чакае музей пад адкрытым небам «Дудуткі».

За шэсць дзён і пяць начэй «ЦэнтрКурорт» просіць заплаціць 510 долараў з кожнага, калі група да 15 чалавек, і 470, калі больш за 30.

Для цікаўнасці я абзваніла турыстычныя кампаніі з пытаннем: «Куды можна з'ездзіць за 500 долараў?». Як мяне запэўнілі ў адным з турыстычных агенцтваў, на гэтыя грошы спакойна можна адпраўляцца на тыдзень у Еўропу (прычым нават з трохразовым харчаваннем). За такія грошы спакойна можна адправіцца ў сямідзённы аўтобусны тур па Францыі. Елісейскія палі, Версаль, Луўр... Што тычыцца пляжнага адпачынку, то ў той жа Крым, Турцыю, Егіпет цалкам рэальна з'ездзіць за гэтыя грошы. Трохзоркавы гатэль у Турцыі з двухразовым харчаваннем будзе каштаваць ад 299 долараў. У Балгарыю можна з'ездзіць і за 120 долараў.

— Што за кошты такія ў нас? — абураецца Вікторыя Церашонак, студэнтка 4-га курса БДУ. — Я толькі нядаўна прыехала з Егіпта. Адпачывала ў гатэлі каля самага мора, сэрвіс там — не параўнаць з нашым, ручнікі чатыры разы на тыдзень мянялі, ложак за цябе запраўлялі. Дыскатэкі, аквапарк, напоі бясплатныя... Дык за пяцізоркавы атэль з сістэмай «усё ўключана», візу і пералёт я аддала 367 долараў. Праўда, гэта са зніжкай, але сам факт такой магчымасці. За тыя ж 500 долараў можна па Еўропе пакатацца.

Калі пасля прэзентацыі тура журналісты запыталіся ў намесніка начальніка ДУ «ЦэнтрКурорт» Сяргея Сасункевіча, на каго разлічаны новыя туры, ён адказаў:

— У першую чаргу гэты экскурсійны тур разлічаны на замежнікаў. Мы вазілі гэтыя праграмы на выставу ў Маскву. І масквічы вельмі імі зацікавіліся, — тлумачыць Сяргей Сасункевіч. — Што тычыцца падобных тураў для беларусаў, то гэта таксама ёсць. Яны ўжо больш накіраваныя на адпачынак. Напрыклад, у якім-небудзь нацыянальным парку. Харчаванне і пражыванне, а таксама невялікія экскурсіі. Кошты могуць быць розныя, вядома ж, гэта танней, чым для замежнікаў. Гэта будзе каштаваць 100—150 долараў. Але ўсё залежыць ад праграмы і колькасці дзён.

**Настасся ЗАНЬКО.**

### Бярэзінскі біясферны запаведнік распрацаваў новы экскурсійны маршрут «Тайны запаведнага балота»

Экскурсійны маршрут прапануецца прайсці пешшу, яго працягласць складае ўсяго некалькі гадзін. У час экскурсіі турысты змогуць пабываць на запаведных балотах і ўбачыць птушак і жывёл, якія там пражываюць. Акрамя таго, падарожнікаў чакае сюрпрыз. Калі яны будуць праходзіць праз лясныя гушчары або балотныя зараснікі, на іх можа «накінуцца» загадкавая істота. Прычым узнікне яна вельмі нечакана, напрыклад, саскочыць з дрэва або вылезе з балотнай вады. Прыгледзеўшыся, турысты змогуць пазнаць у ёй мясцовага балотніка, які ахоўвае свае ўладанні.

**ОАО «ЭКСПЕРИМЕНТАЛЬНЫЙ ЗАВОД ИМ. Н. ГАСТЕЛЛО», 220073, г. Минск, ул. Пинская, 18**

***Извещение о созыве внеочередного общего собрания акционеров***

Собрание состоится 26 апреля 2010 г. в 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Пинская, 18, актовый зал Общества. Регистрация участников собрания производится в день и по месту проведения собрания с 15.00 до 15.55.

**Повестка дня:**

1. О результатах закрытой подписки на акции дополнительного выпуска ОАО «Экспериментальный завод им. Н. Гастелло».
2. Об утверждении решения о выпуске акций ОАО «Экспериментальный завод им. Н. Гастелло».
3. Об увеличении размера Уставного фонда ОАО «Экспериментальный завод им. Н. Гастелло».
4. О внесении изменений и дополнений в Устав ОАО «Экспериментальный завод им. Н. Гастелло».

С информацией (материалами), подлежащими представлению акционерам при подготовке к проведению собрания, акционеры могут ознакомиться ежедневно (кроме субботы и воскресенья), начиная с 20 апреля 2010 г. в отделе кадров Общества с 9.00 до 16.00, а в день проведения собрания — по месту его проведения.

*Совет директоров ОАО «Экспериментальный завод им. Н. Гастелло».*

УНП 100010116

**15 красавіка — Дзень прафілактыкі хваробаў сэрца**

# ІНФАРКТ МОЖА ПРЫХОДЗІЦЬ І БЕЗ БОЛЮ

**Артэрыяльная гіпертэнзія і ішэмічная хвароба сэрца заслужылі сваёй шырокай распаўсюджанасцю асаблівай увагі. Нават пры адсутнасці скаргаў спецыялісты нездарма раяць мужчынам пасля 40 гадоў і жанчынам пасля 45-50 раз у год рабіць электракардыяграму і здаваць біяхімічны аналіз крыві. Сардэчна-сасудзістыя захворванні стабільна лідзіруюць у ліку прычын гібелі нашага насельніцтва. Ці можа змяніцца гэта сітуацыя?**

**Расказвае намеснік дырэктара па тэрапеўтычнай дапамозе Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра «Кардыялогія» Аляксандр БУЛГАК.**

— Адкладанне атэрасклератычных бляшак у сасудах пачынаецца яшчэ ў маладым узросце. Працэс закранае перш-наперш сасуды буйныя, з інтэнсіўным краватокам, у тым ліку, каранарныя. У каранарных артэрыях сэрца найбольш актыўна ўтылізуецца кісларод. Паступова атэрасклератычны працэс можа нараджаць неадпаведнасць паміж той колькасцю кіслароду, якая дастаўляецца да органа, і той, што яму патрэбна. На фоне недастатковасці кровазвароту фарміруецца расшырэнне камер сэрца, змяненне клапаннага апарату.

***— Можна меркаваць, што кожны з нас мае ўсе шанцы сутыкнуцца з інфарктам міякарда. І ўсё ж такі ў некаторых людзей гэта атрымліваецца больш хутка...***

— Вялікае значэнне тут мае генетыка. Але трэба разумець, што ў спадчыну мы атрымліваем не хваробы, а хуткасць абменных працэсаў і шэраг іншых нюансаў. Час надыходу сардэчна-сасудзістай катастрофы ў многім будзе залежаць ад нашага ладу жыцця, наяўнасці спадарожных захворванняў — такіх як артэрыяльная гіпертэнзія, цукровы дыябет, атлусценне... Добра вядомыя ўсім меры прафілактыкі скіраваныя якраз на зніжэнне праяў атэрасклерозу, на тое, каб працэс развіваўся больш павольна.

***— Якім чынам праяўляецца рост бляшак? Ці можа чалавек ніяк не адчуваць гэты працэс і перажыць інфаркт «раптам»?***

— Неадпаведнасць паміж недахватам кіслароду і патрэбай у ім ёсць сутнасць ішэмічнай хваробы сэрца. Гэты дэфіцыт каранарнага кровотоку можа праяўляцца болевым сіндромам — стэнакардыяй, і тады мы гаворым пра болевую ішэмію. Калі ж захворванне дыягнастуецца па даных электракардыяграмы, іншых метадаў даследавання, то размова ідзе пра ішэмію бязболевую.

Клінічныя праявы, як правіла, з'яўляюцца, калі прасвет сасуда закрываецца больш чым на 50 працэнтаў. Да гэтага часу чалавек можа нічога не адчуваць. Але справа не толькі ў памеры бляшкі ці бляшцы як такой у прынцыпе. На фоне росту бляшкі, траўмавання патокам крыві і іншых працэсаў можа парушыцца цэласнасць паверхні апошняй. У месцы пашкоджання фарміруецца тромб, які можа істотна звужаць сасуд, нават калі бляшка ў гэтым месцы невялікая. Узнікае прагрэсіраванне стэнакардыі або інфаркт міякарда. Гэта можа быць як на фоне перыядычных рэгулярных боляў, так і раптоўным, без папярэдніх болевых адчуванняў. Пры наяўнасці боляў утварэнне тромба можна падазраваць, калі развілася нестабільная стэнакардыя — змянілася інтэнсіўнасць і частата болю, калі апошні з'яўляецца пры ўсё меншых эмацыянальных ці фізічных нагрузках.

***— У якіх выпадках узнікае пагроза жыццю, гібель у выніку інфаркту міякарда?***

— На фоне інфаркту мяняецца работа сэрца, з'яўляюцца ўчасткі, якія перастаюць скарачацца або скарачаюцца дрэнна. Узнікаюць парушэнні рытму, што можа прывесці да смерці. Гібель можа наступіць і на фоне вялізнага паражэння, вялікай зоны некрозу. Тады сіла сардэчных скарачэнняў зніжаецца, ціск падае і ўзнікае кардыягенны шок. Гібель у аддаленыя моманты можа наступіць, калі вялікая зона некрозу істотна перашкаджае сэрцу выконваць сваю насосную функцыю.

***— Як жа папярэдзіць сумныя вынікі?***

— Прафілактаваць ішэмічную хваробу. Не курыць, не злоўжываць алкаголем, рухацца, правільна харчавацца — абмяжоўваць соль і жывёльныя тлушчы, кантраляваць артэрыяльны ціск. Ціск стварае не вельмі зручную сітуацыю для работы сэрца. Па-першае, калі на фоне звужаных сасудаў павышаецца ціск, сэрцу даводзіцца выконваць большы аб'ём работы, каб падаць кроў у звужаныя сасуды, на фоне чаго павышаецца патрэба міякарда ў кіслародзе. Па-другое, сама па сабе змена кровотоку ў каранарных сасудах здольная прыводзіць да інфаркту за кошт рэзкага спазму і парушэння харчавання мышцы сэрдца. Што да цукровага дыябету, то ён прыводзіць да парушэння мікрацыркуляцыі ў дробных сасудах — дыябетычнай нейраангіяпатыі, а ў спалучэнні з атэрасклератычным паражэннем гэта не надта спрыяльна. Такім пацыентам трэба яшчэ больш жорстка ставіцца да свайго ладу жыцця.

Праблема заявіла аб сабе ў 50-я, калі пачаў мяняцца лад жыцця чалавека — зменшылася фізічная нагрузка, вялікая колькасць насельніцтва пачала курыць, жыццё стала больш інтэнсіўным, а значыць, стрэсавым. Да таго ж, вырасла пакаленне людзей, у бацькоў якіх была ішэмія. Цяпер гэтыя працэсы развіваюцца ў іх дзяцей і ўнукаў.

***— Інфаркты маладзеюць?***

— Сярэдні ўзрост інфаркту — 50-70 гадоў. Нельга сказаць, што інфаркты маладзеюць, але ў маладых фіксуюцца. Вядомыя какаінавая інфаркты, якія развіваюцца на фоне ўвядзення наркотыку або перадазіроўкі. Што да злоўжывання алкаголем, то тут варта гаварыць аб працяглым спазме сасудаў, што аднойчы і можа выклікаць у сэрцы катастрофу.

***— Ці можна толькі са слоў пацыента адносна ягонага самаадчування паставіць дыягназ інфаркту міякарда?***

— Часам можна, хоць у любым выпадку аналізуюцца даныя клінічных, лабараторных, электракардыяграфічных і эхакардыяграфічных метадаў даследвання. Адразу робіцца біяхімічны аналіз крыві і выконваецца электракардыяграма, якая дае ўяўленне аб электрычных працэсах у сэрцы. Апошнія могуць парушацца на фоне розных паталагічных працэсаў. Пры ішэміі ці вострых праявах інфаркту мы ўбачым характэрную спецыфічную карціну, зможам сказаць, у якой зоне ідзе працэс, наколькі ён вялікі. Ультрагукавое абследаванне дае нам уяўленне аб памерах камер сэрца, функцыі клапаннага апарата, сіле скарачэнняў. Калі на кардыяграме, скажам, усё добра, гэта яшчэ не значыць, што сэрца здаровае. Таму мы і не грунтуемся на адным метадзе даследавання.

***— Што павінен зрабіць у першую чаргу хворы, якога прыхапіла як ніколі?***

— Насцярожыць павінны болевыя адчуванні, звязаныя з эмацыянальным ці фізічным стрэсам. Боль можа суправаджацца слабасцю, галавакружэннем, сэрцабіццём, пачуццём страху смерці. Можа насцярожыць і задышка, якая ўзнікла без інтэнсіўнай нагрузкі. Інфаркт у кожнага чалавека можа працякаць абсалютна па-рознаму. Бывае і адчуванне сціскання, камяку, смылення. Ёсць яшчэ атыповыя формы, калі інфаркт праяўляецца болем у жываце, парушэннем мазгавога кровазвароту, а можа і не быць ніякага болю. Нельга чакаць, пакуль дрэнны стан пройдзе, трэба выклікаць хуткую дапамогу. Вельмі важна, каб дыягностыка і, адпаведна, лячэбныя меры былі прынятыя на працягу першых гадзін.

***— Да прыезду хуткай нітрагліцэрын прымаць?***

— Той, хто ведае пра сваё захворванне, мае пад рукой належныя прэпараты і ведае, што ў якой сітуацыі прыняць. Калі ж чалавек сутыкнуўся з болем упершыню, трэба тэрмінова звяртацца да ўрача. Нітрагліцэрын па-рознаму ўздзейнічае на розных людзей. Эксперыментаваць не варта.

***— Што любіць сэрца?***

— Умераныя фізічныя нагрузкі. Той, хто на працягу дня перамяшчаецца з аднаго крэсла ў другое, мае дэтрэніраванае сэрца. Сэрца павінна перажываць нагрузкі. Хада і плаванне — найбольш аптымальныя. Той, хто займаецца прафесійным спортам, павінен раз у год кантраляваць свой стан незалежна ад самаадчування, паколькі маладыя могуць адчуваць сябе добра нават калі ў сэрцы ўжо ёсць пэўныя змены. Патрэбныя нам і стрэсавыя нагрузкі — пад'ём на 3-5 паверх 2-3 разы ў дзень ці хада з паскарэннем. А вось бег паказаны далёка не ўсім. Мы даўно адмовіліся ад формулы «бягом ад інфаркту», паколькі некаторыя якраз да яго і прыбягалі. Пачынаць бегаць можна толькі пасля кансультацыі ўрача і пры наступным пастаянным кантролі стану.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**

*(Працяг будзе.)*

# 20 працэнтаў мінчан рызыкуюць сустрэцца з новым вірусам грыпу

**У Мінску фактычна завяршаецца прастудна-грыпозны эпідсезон. Штодня ў горадзе рэгіструецца ад 3 да 3,5 тысячы зваротаў гараджан у амбулаторна-паліклінічныя ўстановы з сімптомамі ВРВІ.**

Як тлумачаць спецыялісты Мінскага гарадскога цэнтра гігіены і эпідэміялогіі, эпідсезон, які мінуў, нельга назваць звычайным, бо паралельна з цыркуляцыяй звычайных рэспіраторных вірусаў і вірусаў сезоннага грыпу назіралася і цыркуляцыя новага высокапатагеннага штама віруса грыпу A/H1N1, які выклікаў рэзкі эпідэмічны пад'ём у нетыповы для грыпу час — у кастрычніку-лістападзе 2009 года. Усяго за лістапад вострымі рэспіраторнымі інфекцыямі і грыпам перахварэлі 9,7 працэнта гараджан. Сярод хворых, шпіталізаваных з ускладненымі формамі грыпу (з вірусна-бактэрыяльнымі пнеўманіямі) у 44 працэнтаў ідэнтыфікаваўся вірус грыпу A/H1N1.

У студзені—сакавіку 2010 года захворванне на ВРВІ і грып захоўвалася на перадэпідэмічным узроўні: штодня ў горадзе рэгістравалася ад 4,5 да 6 тысяч выпадкаў захворванняў. Аднак фарміраванне чарговага эпідпад'ёму так і не адбылося.

Вывучэнне стану імунітэту мінчан да вірусаў грыпу паказала, што большасць жыхароў сталіцы маюць ахоўныя цітры да сезонных вірусаў грыпу. Так, 57,5 працэнта абследаваных маюць ахоўны імунітэт да вірусаў грыпу A/H3N2; 35,9 працэнта — да віруса грыпу A/N1N1; 26,3 працэнта — да віруса грыпу B і 19,4 працэнта — да пандэмічнага віруса грыпу.

Па меркаванні спецыялістаў, у выпадку эпідэмічнага распаўсюджвання новага варыянта віруса грыпу A сустрэцца з ім на працягу эпідэмічнага сезона рызыкуюць каля 20 працэнтаў мінчан. Між іншым, санэпідслужба сталіцы ўжо распачала падрыхтоўку да правядзення кампаніі па супрацьгрыпознай вакцынапрафілактыцы на будучы эпідсезон. Усяго плануецца ахапіць супрацьгрыпознымі прышчэпкамі да 20 працэнтаў мінчан, у сувязі з чым кіраўнікам прадпрыемстваў, устаноў і арганізацый сталіцы прапануецца запланаваць выдзяленне фінансавых сродкаў для закупкі супрацьгрыпозных вакцын і арганізацыі імунізацыі працоўнага калектыву.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

Радавыя перамогі

# Стварэнне канцлагера ў Азарычах было ваеннай нямецкай аперацыяй

**...З Аркадзем Пятровічам мы пазнаёміліся зусім нядаўна, 19 сакавіка, у гарадскім пасёлку Азарычы Калінкавіцкага раёна. У гэты дзень туды з'ехаліся былыя вязні канцлагера Азарычы, бо колісь 19 сакавіка 1944 года яны, яшчэ малыя дзеці, па вузкай сцежцы сярод мін выходзілі з-за калючага дроту. У 1944 годзе Аркадзю Пятровічу было 10 гадоў, але перажытыя жахі канцлагера ён не спрабаваў выкрасліць з памяці, а наадварот, усё жыццё па крупінках збіраў інфармацыю, дакументы, любыя матэрыялы пра Азарыцкія канцлагеры. Напярэдадні Міжнароднага дня вызвалення вязняў фашысцкіх канцлагераў, мы сустрэліся з Аркадзем Пятровічам ШКУРАНАМ, членам Рэспубліканскага грамадскага аб'яднання былых вязняў фашызму канцлагера «Азарычы», які лічыць, што немцы ў Азарычах не проста выпадкова сагналі людзей за калючы дрот, а такім чынам правялі спланаваную вайсковую аперацыю:**



— З восені 1943 года пад ударам наступальных аперацый Чырвонай Арміі немцы адышлі да Бярэзіны і Дняпра, ну а на тым участку, які нас цікавіць, была тэрыторыя 9-й арміі, якой камандаваў генерал-палкоўнік Ёзэф Гарпэ (сёння гэта тэрыторыя Калінкавіцкага і Акцябрскага раёнаў Гомельскай вобласці). Пры адступленні немцы гналі перад сабой цывільнае насельніцтва, і так атрымалася, што да зімы людзей аказалася так шмат на тэрыторыі 9-й арміі, што наступіла крытычная сітуацыя: вёскі спаленыя, людзі жывуць у голадзе і холадзе, з'явіліся інфекцыйныя хваробы... Немцы былі вымушаныя асобныя вёскі вылучаць для размяшчэння тыфозных хворых, а таксама перад імі паўстала праблема харчавання (а улічваючы, што абстаноўка на фронце была не на іх карысць, немцам самім харчоў не хапала). Вядома, можна было перакінуць насельніцтва далей на захад, але не хацелі адцягваць на гэта рэсурсы транспартных камунікацый. Таму ўзнікла прапанова ў зоне Азарычаў, дзе размяшчаўся 56-ы танкавы корпус былога ад'ютанта Гітлера Фрыдрых Хасбаха, пакінуць балоцістую тэрыторыю: войскі перавесці на больш узвышаныя месцы, а туды, на пярэднюю лінію фронту, кінуць цывільнае насельніцтва.

***— Гэта было напярэдадні вясны?***

— Яшчэ 31 студзеня 1944 года быў выдадзены загад па 9-й арміі «Аб добраахвотных памочніках з ліку цывільнага насельніцтва», сутнасць якога была ў тым, каб асобна аддзяліць працаздольнае насельніцтва, а жанчын, дзяцей, старых, калек сабраць у вызначаных месцах, — такім чынам пачыналася рыхтавацца асноўная маса. Па нямецкіх звестках, больш за 240 населеных пунктаў было ачышчана ад насельніцтва, а гэта тэрыторыя недзе каля 5 тысяч кіламетраў. Насельніцтва канцэнтравалася ў першасных лагерах уздоўж чыгункі: напрыклад, у Жлобінскай зоне назбіралі 27 тысяч чалавек.

***— А калі непасрэдна пачалося будаўніцтва Азарыцкіх канцлагераў?***

— Па апавяданнях сведкаў, лагеры пачалі будаваць 3 сакавіка, першымі вязнямі былі будаўнікі, яны ж там і загінулі. 10 сакавіка канцлагеры пачалі папаўняцца цывільным насельніцтвам з тэрыторыі Акцябрскага, Даманавіцкага, Парыцкага і іншых раёнаў, а 13-14 сакавіка сюды прыгналі і людзей са Жлобінскага раёна. Прынамсі, у маёй роднай вёсцы Параслішча лагер існаваў з 1943 года як працоўны, але я добра памятаю, калі немцы пачалі фарміраваць кантынгент для папаўнення Азарычаў. Гэта было недзе 10-11 сакавіка, немцы пачалі зганяць у лагер (а ён быў досыць вялікі — недзе 800 на 450 метраў) насельніцтва, паставілі ўсіх у шарэнгу і адабралі працаздольных. Ну а дзяцей, жанчын і старых сталі выганяць з лагера. Прычым на выхадзе прымушалі выкідваць клункі з адзеннем і пажыткамі. І цэлы дзень мы крочылі ў напрамку Азарычаў па гразі, па размытай дарозе — усяго кіламетраў недзе 25.

***— А здагадваліся, куды вас вядуць?***

— Мы ж людзі мясцовыя, ведалі, што дарога вядзе ў Азарычы. Паколькі было чутно, што страляюць гарматы, самалёты лятаюць, то мы ведалі, што недзе там побач лінія фронту. Але з якой мэтай нас туды вялі, мы не ведалі. Шмат хто лічыў, што нас перададуць Чырвонай Арміі, іншыя лічылі, што нас знішчаць...

***— Колькі ўсяго цывільнага насельніцтва было сабрана ў Азарыцкіх канцлагерах?***

— З улікам 27 тысяч са Жлобінскай зоны ўсяго ў трох лагерах — Дзерці, Падасінніку і Азарычах — па нямецкіх дадзеных было сабрана 46 тысяч і тры чалавекі (заўважце, якая пунктуальнасць!) Папярэдняя лічба была 47 361, так што, атрымліваецца, што па дарозе загінула 1358 чалавек... Сапраўды, забітых было шмат. Я ніколі не забуду карціну: ішла жанчына з двума дзецьмі, аднаго цягнула наперадзе, другога ззаду. І спынілася, каб перадыхнуць, а немец стрэліў з аўтамата ёй у галаву... Яна звалілася, па твары бяжыць кроў, і дачушка гадоў 5 кліча яе «мама, мамачка!» і ручкай так па твары мажа... Складана было ўсё гэта перажываць — забівалі ўсіх, хто не мог ісці. Дарэчы, я сустракаўся ў свой час з адным будаўніком канцлагера, які выпадкова выжыў. Ён сцвярджаў, што першапачаткова трупы з лагера вывозілі. Недзе ў 500 метрах ад лагера іх скідвалі ў багну, палівалі серай ці нечым іншым, і яны там гнілі...

***— А што памятаеце пра час знаходжання ў самім канцлагеры?***

— Там быў толькі калючы дрот і балота. Ніводнага памяшкання, ні крыніц з вадою, ні прыбіральняў. Хацелася піць, жанчыны падпаўзалі бліжэй да дроту, дзе снег быў чысцейшы, аднак на вуглах стаялі вышкі з кулямётамі, і калі нехта з'яўляўся ля агароджы, то расстрэльвалі без папярэджвання. Тут ляжалі трупы, тут ужо бралі і ваду... Калі мы з'явіліся, то яшчэ можна было выбраць месца трохі вышэйшае. Па начах жанчыны збіралі дзетак у кучу, накрывалі рыззем, пастаянна тузалі іх, каб тыя не замерзлі. Недзе дзве ночы тэмпература апускалася да мінус 8-10 градусаў, потым пайшоў снег, дождж, была адліга. Памятаю, што калі нас ужо выводзілі з лагера, то ўсё наўкола была замініравана, акрамя невялікага праходу. І адна бабка мясцовая вырашыла хутчэй дадому патрапіць і пабегла напрасткі праз поле. Ёй крычаць: «Стой! Там міны!», а яна не слухае. Прабегла метраў пятнаццаць, і раптам яе падняло на метр ад зямлі, андарак стаў як парашут, а потым выбух... Гэты момант таксама ніколі не забудзецца...

***— Дык усё-такі, Аркадзь Пятровіч, чаму ж немцы перакінулі цывільнае насельніцтва на пярэдні край абароны?***

— У справаздачы штаба 9-й арміі пра дэпартацыю цывільнага насельніцтва ад 28 сакавіка 1944 года дакладна распісаныя ўся цырымонія і прычыны. Там жа і напісана, што група насельніцтва ставіцца ў якасці шчыта для Чырвонай Арміі: лагеры немцы ставілі ў тых месцах, дзе мог быць праход войскаў, бо ў астатніх месцах была багна. Мелася на ўвазе, што войскі Чырвонай Арміі, калі немцы адыдуць, пачнуць вызваляць хворых на тыф, і хварэць пачнуць і салдаты. Ну і, вядома, немцы таксама хацелі ачысціць сваю тэрыторыю ад хворых, каб прадухіліць заражэнне інфекцыямі сваіх салдат. Яшчэ раз падкрэсліваю, што гэта не проста людзей сагналі ў лагер — гэта была ваенная аперацыя: на пярэднім краі абароны сабралі людзей, стварылі шчыт, і за плячыма няшчасных пакутнікаў можна была спакойна адступаць. Хоць недалёка ад канцлагераў знаходзіліся войскі Чырвонай Арміі, яны не маглі нічога зрабіць, бо тэрыторыя прастрэльвалася мінамётамі, і тады мы ўсе проста загінулі б. Аперацыя доўга распрацоўвалася і рыхтавалася, бо 27 тысяч са Жлобінскай зоны былі перакінутыя па чыгунцы, а проста так вагоны для 9-ці саставаў не збярэш. Прычым аперацыя праведзена была вермахтам, а не часткамі СС: у зборы насельніцтва прымалі ўжо чатыры нямецкія корпусы, 13 дывізій, вышэйшае нямецкае камандаванне...

***— Ці ёсць аналагі Азарыцкіх канцлагераў?***

— Не, гэта адзіны лагер у часы Другой сусветнай вайны, дзе непасрэдна ўдзельнічалі военачальнікі такога высокага рангу і пры ўдзеле такога кантынгенту войскаў. У Азарычах была высокая смяротнасць — 15 тысяч за 10 дзён. Калі падлічыць колькасць смерцяў за дзень і параўнаць з сусветна вядомымі страшнымі канцлагерамі Бухенвальдам, Аўшвіцам, якія існавалі доўгі час, то, мяркую, у Азарычах смяротнасць будзе як мінімум не ніжэй. На жаль, ніхто пытаннем Азарычаў ніколі не займаўся грунтоўна. Няма даследаванняў прафесійных гісторыкаў, няма ў нашых архівах дакументаў на гэты конт, ну а нямецкія дакументы доўгі час былі недасяжныя.

**Гутарыў Павел БЕРАСНЕЎ.**

